


неаднаразова атрымлівала ў XV – XVII стст.

З XIV – XV стст. у гістарычных крыніцах упамінаецца другое значнае княства на тэрыторыі Чашніцкай зямлі – Чарэйскае. Князі Лукомскія і Чарэйскія прымалі актыўны ўдзел ва ўсіх войнах, якія вяло ВКЛ. У гісторыі ўпамінаецца баявы полк вояў з Лукомскага княства, які ўдзельнічаў у Грунвальдскай бітве 1410 г. У гэтай бітве сышліся аб'яднаныя войскі ВКЛ і Каралеўства Польскага з войскам крыжакаў. Бліскучая перамога над крыжакамі была настолькі ашаламляльнай, што землі ўсходніх славян 5 стагоддзяў не ведалі германскай агрэсіі. Лукомскае і Чарэйскае княствы прымалі ўдзел у міжусобнай барацьбе паміж Ягайлам і Андрэем Полацкім (1385 г.), а таксама паміж Жыгімонтам Кейстутавічам і Свідрыгайлам Альгердавічам (1433 г. ) (гл. асобныя артыкулы *Лукомскае княства, Чарэйскае княства*).

У XV – XVI стст. на Чашніцкай зямлі згадваецца яшчэ адна значная валасць – Ульская, якая разам з Чашнікамі ўяўляла даволі значны маёнткавы абшар (гл. асобны артыкул *Ула і Ульская валасць*).